СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЧЭРВЕНЯ 2017 г. АЎТОРАК №110 (28474)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Зялёная» энергетыка вады



Таямніцы асабняка ў Клімавічах



Гісторыі піратаў і піратцва

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй АЎХІМЕНЯ, старшыня праўлення ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа»:**

*«Беларуская валютна-фондавая біржа і тэхнічна, і маральна гатовая да прамога ўдзелу фізічных асоб у таргах. Але ёсць моманты, якія павінны быць урэгуляваны на ўзроўні нарматыўна-прававых дакументаў Нацыянальнага банка. Ужо сёлета фізічныя асобы змогуць выходзіць на біржу ад імя банкаў. У прынцыпе фізасобы гэта не адчуюць. Працэдура будзе дастаткова простай. Грамадзянін зможа аформіць інтэрнэт-банкінг або ў мабільным банкінгу заяўку, і яна пойдзе на біржу. Прамы выхад фізічных асоб прапісаны ў нас у плане па лібералізацыі на пачатак 2018 года».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.06.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8759 | ▲ |
| Еўра | 2,1023 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0720 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Прыёмная кампанія

# Пад самым пільным кантролем

## Падчас ЦТ лепш спадзявацца толькі на веды



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.



**Вось скажыце, як можна прыйсці на цэнтралізаванае тэсціраванне з чужым пашпартам або ксеракопіяй уласнага пашпарта, таму што арыгінал знаходзіцца ў пасольстве? Або ўляцець у экзаменацыйную аўдыторыю літаральна ў апошнія секунды перад распячатваннем пакетаў з экзаменацыйнымі матэрыяламі? Але арганізатары ЦТ даўно і нічому не здзіўляюцца: такія кур'ёзы здараюцца штогод. Учора ў краіне стартаваў марафон пад назвай «цэнтралізаванае тэсціраванне», які завершыцца толькі ў ліпені...**

СТАР. 4



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

■ Гісторыя і сучаснасць

# «СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ» ВАКОЛ ЛІХТАРНАГА СЛУПА

## У сталіцы ў Верхнім горадзе з'явіліся ўнікальныя арт-аб'екты

**Студэнты Акадэміі мастацтваў распісалі шэсць фартухоў светлавых апор у каляровай гаме, уласцівай слуцкім паясам. Праект рэалізаваны ў межах акцыі «Мінчане роднаму гораду» і накіраваны на аднаўленне гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.**

Дызайн саміх апор з узорамі, якія выкарыстоўваліся на паясах, быў распрацаваны **мастаком Мікалаем МІХАЛАПАМ.** Перад вайной ён быў першым дырэктарам Дзяржаўнай карцiннай галерэі г. Мінска, а ў пасляваенныя гады стаяў на чале мастацкай прамысловасці БССР. Дарэчы, калекцыя знакамітых на ўвесь свет паясоў захоўвалася менавіта ў гэтай галерэі, але падчас Вялікай Айчыннай вайны была страчана. Мікалай Пракопавіч пастараўся захаваць памяць аб нацыянальным сімвале ў гарадскім асяроддзі, па ўсім Мінску выкарыстана каля тысячы такіх апор. Першыя варыянты выконваліся з чыгуну, цяпер жа іх часткова замянілі лёгказборныя пластыкавыя канструкцыі. Аднак, магчыма, горад вернецца да сувымернага па коштах першапачатковага варыянта.

З ініцыятывай яшчэ больш увагі прыцягнуць да гістарычнага здабытку выступіла адміністрацыя Цэнтральнага раёна горада Мінска, якую падтрымалі Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, прадпрыемства «Мінская спадчына» і Мінгарвыканкам. Суарганізатарам урачыстага адкрыцця аб'ектаў стала Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Падчас мерапрыемства таксама можна было ўбачыць цяперашнія слуцкія паясы, якія вырабляе аб'яднанне «Белмастацпромыслы», пазнаёміцца з калекцыяй адзення з элементамі нацыянальнага беларускага арнаменту. Была арганізавана выстава-продаж сувенірнай прадукцыі.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!